*УДК 930.23*

***Вольга Іванова**, дацэнт кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (г. Мінск, Беларусь) (ivanova.volga.s@gmail.com)*

# ВУСНЫЯ ЎСПАМІНЫ ЯК КРЫНІЦА ПА ГІСТОРЫІ МІКРАТАПАНІМІІ ВЁСКІ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ВЁСКІ ЛІПЛЯНЫ ЛЕЛЬЧЫЦКАГА РАЁНА ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ)

**Ключавыя словы:** вусны ўспамін, мікратапанімія, Убарцкае Палессе, крыніцазнаўства, лакальнасць, пазалакальнасць, гаспадарчыя стратэгіі.

Палескі рэгіён здаўна прываблівае вялікую колькасць даследчыкаў розных напрамкаў, якія спрабуюць зафіксаваць рэлікты найбольш архаічных праяўленняў гісторыі і культуры, захаваных у лакальна адасобленых супольнасцях. Вёска Ліпляны знаходзіцца на так званым Убарцкім Палессі – памежжы Мазырскага і Турава-Пінскага рэгіёнаў. Гістарычна і культурна Убарцкае Палессе мае больш сувязяў з Украінскай Жытоміршчынай, чым з Туравам, Пінскам і нават заходняй часткай Лельчыцкага раёна. Ліпляны знаходзяцца ў 4 км ад раённага цэнтра і прыкладна на аднолькавай адлегласці ад Мінска і Кіева, Гомеля і Пінска. Актыўнае этналігвістычнае і мікратапанімічнае вывучэнне гэтага рэгіёна бярэ свой пачатак у 1980-я гг. [1] і працягваецца да нашага часу [2, 3]. Так у 1990-я гг. Ліпляны наведала мовазнаўчая экспедыцыя Івана Кучука [4], у 2006 і 2011 г. – этнаграфічныя экспедыцыі Вольгі Лабачэўскай і Таццяны Валодзінай. Значную працу ў гэтым напрамку правялі таксама Анатоль Атнагулаў [5] і складальнікі кнігі «Памяць» [6].

У 2018 г. было праведзена комплекснае даследаванне гісторыі в. Ліпляны Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці [7], якое было заснавана пераважна на вусных успамінах, але ўключала ў сябе і іншыя крыніцы (апублікаваныя і архіўныя дакументы сямейных архіваў, летапіс вёскі, што вядзецца мясцовым домам культуры і інш.) Падчас яго былі запісаны біяграфічныя ўспаміны 22 жыхароў і ўраджэнцаў вёскі, агульнай працягласцю каля 40 гадзін [8]. Яны акцэнтаваліся на гісторыі вёскі, але заўважнай тэмай з'яўлялася лакалізацыя тых ці іншых месцаў у жыццёвай прасторы вяскоўцаў. Відавочна праяўлялася сувязь паміж геаграфічнымі асаблівасцямі і іх ўздзеяннем на гаспадарчыя стратэгіі, стыль жыцця, светапогляд і культуру вяскоўцаў.

Самым цікавым і старажытным архіўным дакументам, якія дае грунтоўную візуалізацыю вясковай прасторы з'яўляецца падрабязны план вёскі Ліпляны за 1866 г., які захоўваецца ў НГАБ [9]. Тут пазначана больш за 50 навакольных мікратапонімаў.

Мэта дадзенага артыкула – ацаніць значнасць вусных успамінаў як крыніцы для вызначэння геаграфічных асаблівасцей вёскі, фіксацыі і лакалізацыі мікратапонімаў і параўнаць іх з апублікаванымі і неапублікаванымі (архіўнымі) крыніцамі.

Значную частку паверхні вакол вёскі складалі балоты, якія збольшага і вызначалі краявід гэтых мясцін. Таму мясцовыя жыхары апісваюць гэтую прастору пераважна так: «*У Ліплянах вады много. Кругом вунь вода. Обдыме дзярэўню вода*» (*Вольга Сечка*). Таксама называюць вялікую колькасць азёраў, якія з цягам часу сталі балотамі. Яны не адзначаюцца на сучасных картах ці ў мікратапанімічных даследаваннях, але часам згадваюцца ў інвентарных апісаннях мінулых стагоддзяў, а таксама ва ўспамінах вяскоўцаў (гл. Дадатак).

Пасля балотаў самы вялікі ўплыў на ландшафт, свядомасць і штодзённае жыццё ліплянцаў на працягу ўсёй гісторыі мела р. Убарць. Яе назва ўпершыню згадваецца ў пісьмовых крыніцах у 1412 г., і існуе некалькі версій яе паходжання. Першая сцвярджае, што гэта гідронім, створаны паводле ландшафтных тэрмінаў «уборок», «прыбор» – мясцовасць каля бароў. Другая, што назва паходзіць ад борцяў, якія вешалі на дрэвы каля рэчкі. Яшчэ адну легенду пра паходжанне назвы р. Убарць, ад словаў «убіраць» ці «забіраць», запісалі ў 2011 г. ад жыхаркі суседняй з Ліплянамі в. Пабеднае этнографы Таццяна Валодзіна і Таццяна Кухаронак [10]: «*Адна бабуля расказвала, што пракляла [рэчку] маці за сваё дзіця. Вышла маці работу рабіць, а дачка адзіная пайшла да ракі гуляць і патанула. Маці прыйшла да ракі. Стала на калені і стала так праклінаць, так праклінаць, якімі толькі словамі не праклінала, [што яна] ўбірае людзей. Убарць – бо ўбірае ў сябе людзей. Праклятая рака, ні пачатку, ні вусця няма*» (*Марыя Іванаўна Кольбіна*).

Жыхары Ліплян акрэсліваюць уздзеянне ракі на штодзённасць вёскі ў другой палове XX ст., як вельмі значнае і нават вызначальнае: «*Вёска Ліпляны размешчана ў пойме ракі Убарць. Таму маё дзяцінства вельмі звязана з лоўляй рыбы. Калі восеньскія паводкі, вада прыбывае і потым наступаюць маразы. З'яўляюцца велізарныя коўзанкі*» (*Георгій Казачэнка*); «*Рыбы сказаць, што было шмат – гэта значыць нічога не сказаць. Лавілі ўсе. Снасці былі пачынаючы ад вуды: круш, квок, кломля, невад, перамет, старожні і гэтак далей. Рыбу лавілі круглы год*» (*Міхаіл Сечка*).

Нягледзячы на тое што вёска Ліпляны з'яўляецца даволі адасобленай, геаграфія ўспамінаў шырокая. Яны апісваюць ўзаемасувязі і кантакты ліплянцаў, а таксама характарызуюць асаблівасці іншых лакальных супольнасцей. Найбольш часта кажуць пра найбліжэйшыя Лельчыцы, Ручное, Пабеднае, Буйнавічы, Буда-Лельчыцкую, Чырвонабярэжжа, Буда-Сафіеўку, Замошша, Манчыцы. На захад ад Лельчыц згадваецца менш вёсак: Баравое, Картынічы, Глушкавічы, Дзяржынск. З іншага боку, лакальная прастора ліплянцаў звычайна не распаўсюджвалася далей за г. Мазыр. Трэба адзначыць, што мясцовыя жыхары ў значнай колькасці выпадкаў выкарыстоўваюць старыя назвы паселішчаў. У 1930–70-я гг. адбываліся шматлікія перайменаванні на савецкі лад. Новыя назвы набылі Радзілавічы (Дзяржынск), Злодзін (Чырвонабярэжжа), Фальварак (Пабеднае), Асмолін (Ударнае), Берзавод (Чапаеўск), Магільнае (Мірнае). Ва ўспамінах выкарыстоўваюцца абедзве назвы: і гістарычная, і савецкая.

Назва самой вёскі Ліпляны (Liplanie, Lyplany, Liplany, Ліпляне, Ліпяне, Ліпяны) па сваёй структуры належыць да тых тапонімаў, якія першапачаткова ўтвараліся як абазначэнне жыхароў паводле асаблівасцей іх месца пражывання, а ўжо потым пераносіліся па асацыяцыі і на само паселішча. Як вынікае з этымалогіі, ліплянамі ці ліпянамі будучых жыхароў вёскі сталі называць таму, што яны першапачаткова жылі або ў мясцовасці, парослай ліпамі, або каля рачулкі Ліпа, якая магла існаваць там у даўнейшыя часы. Даволі разгорнутую версію аб паходжанні назвы Ліпляны даюць самі жыхары вёскі. Яны сыходзяцца на тым, што назва іх вёскі паходзіць ад слова «ліпа» і звязана са з'яўленнем іконы на дрэве: «*Ліпляны – вельмі прыгожая вёска. І ліпы раслі, і ліпы растуць... І ў нас такая была ліпа вялікая. Заўсёды асацыяцыя, што Ліпляны – ліпы*» (*Людміла Ашомка*); «*Гэта колісь было такэ, што на ліпе найшлі ікону, вельмі хорошую. І та ікона была добра прымошчана, прыстроена к етой ліпе. І цэркву зробілі*» (*Ганна Лось*); «*Расказвалі яшчэ даўнія тыя людзі, што на ліпіне ікона образовалася сама. З ліпіны выросла*» (*Клаўдзія Лось*). Наіўная народная этымалогія дазваляе дапоўніць пісьмовыя звесткі і тэорыі даследчыкаў аб паходжанні назвы вёскі. Акрамя гэтага, варта адзначыць, што да вайны карэнныя жыхары называлі вёску Ля́пляны (адпаведна жыхароў называлі «ля́плянец», «ля́плянка»). Ліпля́намі, ліпля́нцамі, ліпля́нкамі яны сталі ўжо ў другой палове XX ст. Такі варыянт назвы, бліжэйшы да рускай мовы, быў больш зручным для пераважна прыезджых савецкіх кіраўнікоў і інтэлігенцыі.

Вёска Ліпляны даволі вялікая, падзяляецца, на пяць частак: Малое Сяло, Вялікае Сяло, Вялікае Поле, Пасёлак і Печка. Паслядоўнасць разрастання вёскі яе жыхары фіксуюць даволі дакладна: «*В началі было Малое Село. На [Вялікім Полі] да вайны хатоў не было. Этыя людзі ўсе жылі па хутарам. По полях по своіх. У каждого было поле ў лесе, там хату станавілі і жылі там. А ета ж перад вайною тута насялілі Пасёлак новы. Ужо падсаедзінілі, штоб Ліпляны былі. А іменно самые карэнныя жыцелі – это там, на Малым Сяле жылі*» (*Клаўдзія Лось*) (гл. малюнак).



Карта р. Убарць з пазначэннем в. Ліпляны, складзеная інжынерам Якубам Ясінскім. 1792 г.

Малое Сяло, найбольш ізаляваная і аўтэнтычная частка Ліплян, адзіная знаходзіцца на правым беразе Убарці, на так званым плывуне – узвышшы-востраве, якое з усіх бакоў атачаецца вадой. Яно захавалася ў малазмененым выглядзе і сёння. Рэспандэнты вельмі падрабязна апісваюць яго геаграфію, адрозненні ад іншых пасёлкаў вёскі і асаблівасці: «*[Цэнтрам Малога Сяла] быў Дзярытак. Па шырыні метраў дзесяць-пятнаццаць і метраў пяцьдзесят па даўжыні. З усходу ідзе дарога на Ручное. На захад – гэта дарога пайшла на Лельчыцы. На поўнач – гэта дарога на Вялікае Сяло. Там паром быў, паромная пераправа. На Дзярытку праходзілі часцей за ўсё танцы. Тут, калі праводзілі ў армію, малады чалавек кідаў хустачку. Развітваўся з усімі. Тут яго і сустракалі, калі ён адслужыў належны тэрмін. [Тут пасля вайны] інваліды начавалі для таго, каб з раніцы пайсці збіраць у людзей міласціну. Тут жа цыганскія буды начавалі і плытагоны, якія гналі лес. І заўсёды праз масток дзяжурыў адзін чалавек. Вясной, увосень, дый летам пераправіцца можна было толькі з дапамогай парома. Вазілі сена, вазілі дровы, вазілі ўсё. Вясной, калі вёска [з усіх бакоў] абмываецца вадой, жыццё было звязанае толькі праз мосцікі, якія ў час вясновага крыгаходу вельмі часта зрывала*» (*Міхаіл Сечка*).

Асноўнай і самай вялікай часткай вёскі было Вялікае Сяло. Вялікае Поле, ці Вялікае Балота, першапачаткова было ўрочышчам, дзе стаяла царква, і толькі перад вайной, пасля сцягвання навакольных хутароў, яно стала часткай вёскі. У гэты ж час узнік і Пасёлак, дзе сялілася пераважна калгасная эліта і інтэлігенцыя. Невялічкі пасёлак Печка знаходзіўся ў цэнтры вёскі, каля кар'ера, дзе бралі гліну для цагельні. У 1960-я гг. некалькі сем'яў пры пашырэнні здабычы гліны былі адтуль пераселеныя. У 1990-я гг. за Пасёлкам, у напрамку в. Пабеднае, на былым калгасным полі былі пабудаваны новыя хаты – аграгарадок. Цікава, што паміж карэннымі жыхарамі афіцыйныя назвы вуліц – Набярэжная (Малое Сяло), Савецкая (Вялікае Сяло), Кашырцава і Лугавая (Вялікае Поле), Заводская, Школьная і Садовая (Пасёлак), Спартыўная і Маладзёжная (Новы Пасёлак) – амаль не ўжываюцца. Застаюцца яны толькі як паштовыя афіцыйныя адрасы.

Для характарыстыкі мясцовасцей вакол вёскі выкарыстоўваецца вялікая колькасць мікратапонімаў. Як ўжо адзначалася на плане маёнтка 1866 г., іх налічваецца каля 50 (гл. Дадатак). Шматлікія мікратапонімы, зафіксаваныя тут, сучасным вяскоўцам ужо невядомыя. Гэта Высокае, Гарчэнь, Дуброва, Дубровец, За Мохам, Закалодне, Міжгор'е, На Горцы, На Грудках, Навалоўцы, Назадне, Накранавіцы, Наўглі, Осык, Пералайна, Прысынак, Пярлок, Пясінае, Пясочнае, Расач, Урова, Удабраго, Укрэні, Унарву, Унашэвічах, Штоварыцнам. Верагодна гэта звязана са зменамі ў сістэме землекарыстання (калектывізацыя) і меліярацыяй. Іншыя назвы на карце, ліплянцы канкрэтызуюць: Гліна – Глі́нішча, Глумча – Гу́мна, Лозніца – Ле́заніца. Гэта можа тлумачыцца як розніцай паміж гутарковай і пісьмовай мовай, так і няўстойлівасцю назваў. Шмат урочышчаў, якія актыўна прыгадваюцца сучаснымі ліплянцамі – Бярэзнік, Енціпіха, Елье, Жукоў, Клінаваха, Роўля, Нелепоў, Саракан – на карце не пазначаны. Трэба меркаваць, што ў сярэдзіне XIX ст. былі адзначаны пераважна валоданні землеўладальніка Ахроменкі, а ў сучасных мікратапонімах назіраецца відавочная прыналежнасць да асобных сялянскіх гаспадарак. Апісанні месцазнаходжання некаторых урочышчаў – Доўгае, Ніўча – таксама не супадаюць. Усё гэта сведчыць пра даволі істотную дынаміку змен мікратапаніміі Ліплян.

Для кожнай з пяці частак вёскі згадвалася пэўная колькасць мікратапонімаў. Паколькі прастору Малога Сяла ўтваралі р. Убарць і вялікая колькасць азёраў, а таксама яна межавала з бліжэйшымі Лельчыцамі і в. Ручное, то яны трапляюць ў апісанне прасторы Пасёлка: «*Азярэц знаходзіўся за рэчкай на Малым Сяле. [Гэтамсама і] возера Торцін. Яшчэ ёсць Лысая Гара. Там пясок быў. Дарога [ішла] на Лельчыцы з Малога Сяла: па левы бок – Торцін, а па правы – Лысая Гара. І паміж імі мы ішлі на Лельчыцы і выходзілі на мост. Бараво́е было проста за Малым Сялом. Побач быў Жуко́ў. Алешнік такі, сенажаць, [куды] хадзілі сена грэбці. Там бачыла лася. Далей было балота. [Урочышча] Доўгае [знаходзілася] за Малым Сялом у бок Ручнога. Казалі: «Пойдзем на Доўгае сена касіць». Красная Горка – высокая гара, дзе сілас нарыхтоўвалі, падводамі вазілі*» (*Ніна Лось*).

Прастора ўздоўж р. Убарць з боку Вялікага Сяла выкарыстоўвалася вяскоўцамі пераважна як сенажаць: «*Пойма Убарці была размеркаваная паміж сялянамі. Там яны касілі. Былі такія месцы каля рэчкі, якія называліся Петрыкава Лучка, Енціпіха, Клінаваха, Карбана, Лезаніца. Енціпіха – гэта такое месца вышэй. І там расла не вельмі добрая трава. [Нават вершык для гэтага склаў Мікалай Мар'ічын]: "Во сабраліся Самсоны, сталі думаць і гадаць, як Енціпіху абмінаваць". Рэчка цякла, некалькі разоў мяняла сваё рэчышча. У нас гэта месца называлі Лучка. Клінаваха – гэта на рэчцы так называлася метраў 200*» (*Георгій Казачэнка*).

Часта згадваюцца і уладальнікі палёў і сенажацяў, былыя жыхары вёскі: «*За́падаўжа – гэта былі палі людскія. На Вялікім Сяле [на поўнач], дзе селішча мельніка – Снікі́. За Снікамі ідзе Западаўжа. За Западаўжам – Лешнік. Казалі: "Пойдзем гуляць за Лешнік". Алешнік там рос. А за Лешнікам – рэчка. Клін – гэта каля рэчкі. На Кліну сена [касілі]. І там [урочышча] Марыніча. У полі ўзгорак быў. Марыніч там жыў. [Багаты чалавек]. У яго гумна там былі са збожжам. У рэчцы быў вір і казалі на яго Ка́доўб. Там забараняліі нам купацца*». (*Ніна Лось*).

Свае назвы існавалі і для асобных частак, селішчаў Вялікага Сяла: «*Во́смаля – на Вялікім Сяле. Там Паўлечка Мікалай, ветэран, жыў. Кветкі вельмі*

*добрыя раслі. Цяпер такіх кветак няма. Прыгожа было»* (*Ніна Лось*); «*[На Вялікім Сяле, каля могілак быў] выган. Сюдэю мы каровы выганялі. Тут не было палёў раней. Бо было балота скрозь. Далей былі асінкі, бярозкі... Прыгожае было месца. Называецца Даліна. Калі вясна пачыналася – тут была скрозь вада. Праз наш двор ішла вада. На канцы вёскі жыў дзядзька наш Васіль. Там было таксама поле. Называлася месца – Пало́віна. Там такая канаўка была. Мы туды купацца хадзілі, калі ў рэчцы шчэ багата было воды. Называлася Раве́ц, і там сціралі. [Сучасная дарога з Вялікага Сяла на Пасёлак] называлася Новы Шлях, а праз карчы, да завода старога – Стары Шлях. [Ад канца Вялікага Сяла] была канава. Яе асушылі. [Ад яе] мост быў драўляны, старадаўні. Называлася месца Запача́пін. Тут заўсёды размывала ўсё*» (*Людміла Ашомка*).

Шмат урочышчаў было паміж Вялікім Сялом, Вялікім Полем і Печкай. Асноўнае з іх – У Лузе. Яго вялікасельцы і вялікапольцы згадваюць пераважна ў сувязі з падзеямі апошняй вайны: «*Паміж Вялікім Полем і Вялікім Сялом – Запачапін быў. Запачапін праходзіш – Гнілое Балота. Па тым балоце – Пераброд, там кладкі былі. І ўжо выходзілі У Луг. У Князевым Бродзе бралі воду на завод цагляны. Бочкі вазілі. А за Лугам Роўля ідзе. "На Роўлю пойдзем за шчаўём". На полі Роўля пахаваны быў Кашырцаў Сяргей [камандзір партызанскага атрада]. Петрыкава Лучка – гэта У Лузе. Узгорак такі, дзе касілі сена. Глі́нішча – за Пасёлкам у бок Луга. Неле́поў – гэта за Вялікім Полем. Там арэшнік рос. Побач Саўчын, лес. Слепча – гэта у бок Луга, сенакосы былі на Слепчы. У Лузе Марыю [Лось] расстралялі. Там магілка была. Казалі "Мар'іна магіла". Яе дочка, як меліярацыя праходзіла, бегала да казала: "Хаця б магілу не заарыце". Так яе і пакінулі, яна абгароджаная стаіць. У Лузе*» (*Ніна Лось*).

Шмат урочышчаў згадваецца на поўнач ад Пасёлка: «*Ідзеш дарогай [на поўнач ад Пасёлка] – Пералайна, за Пэралайна палі былі калхозныя. Потым Бярэзнік ідзе. Даходзіш да Брода, і ўсё – тут пачынаецца Валовае, а Бярэзнік ужо заканчваецца. За клюквай хадзілі. Там і балотца такое. Лес. Гэта самае грыбное месца было. Пералайна, дзе мой дзед жыў, там былі грыбныя месцы, ён туды заходзіў і адразу набіраў. Былі свае грыбочкі. Валовае – вельмі вялікі лес. Сасновы лес. Закружжа – гэта не даходзячы Бярэзніка. Мы хадзілі туды лён драць. Сеялі калгасныя палі. Печка – гэта там дзе "очісціцельные". Дзе Валовае. Там былі печы. Ці то смалу пераганялі, ці то дзёгаць рабілі*» (*Ніна Лось*); «*У памяці Валовае, Бярэзнік, куды хадзіў у ягады і грыбы... Паміж намі і Лельчыцамі цячэ крыніца. Гэта месца забалочанае. Урочышча называецца Ельe. Падчас вайны Ельe было такое, што чалавеку невялікага росту можна было схавацца. Гэта 70–80 гадоў гэтаму лесу. Людзі хаваліся там, каб немцы ці паліцаі не маглі дастаць*» (*Уладзімір Паўлечка*); «*Пералайна – гэта ў лесе [былы хутар]. У лесе і Лезаніца. Была Лезаніца адна на рэчцы, другая – у лесе. Мы туды хадзілі ў ягады. А каля рэчкі – там рыба вадзілася*» (*Георгій Казачэнка*).

Паміж Пасёлкам і Лельчыцамі найбольш адзначаюцца Ніўча, Ельe і Саракан. Яны таксама падчас вайны служылі сховамі для жыхароў Пасёлка, а таксама выступалі як тэрыторыя, што звязвала Ліпляны з Лельчыцамі: «*Падчас вайны хаваліся ў такім урочышчы, называлася Саракан. Ад слова "сарока". Яшчэ Ніўча я ведаю. У Ельы хаваліся пасялкоўцы і велікапольцы. А вялікасельцы – за Вялікім Сялом – У Лузе*» (*Ніна Лось*) (гл. Дадатак).

Дакладна вызначалася мяжа паміж прасторай ліплянцаў і жыхароў іншых сумежных населеных пунктаў: «*Ле́заніца – гэта як пераходзіш ад Пабеднага асноўны Мазырскі Шлях [дарога з Лельчыц на Мазыр] і проста ідзеш, то гэта Лезаніца. Туды па ягады хадзілі. Яно ўжо да Ліплянаў не адносіцца. Такі лес – і дубы, і сосны, купін вельмі шмат. Па купінах раслі ягады. Гу́мна, дзе засяваў палі Готліб, дзе былая Прыгарадная гаспадарка [размяшчалася]. Калгас арганізаваўся, то там такі́ стаялі, дзе малацілі. Як на Лельчыцы мы шлі, выходзілі з Ніўчы на Боло́нье. Болонье, ужо адносіцца к Лельчыцам. Не к нам. Саракан – гэта паля дзе зрабілі. Паміж калгасам і Вялікім Сялом*» (*Ніна Лось*).

Такім чынам, мікратапонімы (іх выяўлена больш 70) ў вусных успамінах паўстаюць як своеасаблівы шляхаводнік ці карта значных для навакольных жыхароў мясцін. Яны выкарыстоўваюцца для апісання геаграфічных асаблівасцей вёскі ў цэлым і кожнага з пасёлкаў, размежавання паміж сваёй і чужой прасторай, аповяду пра гістарычныя падзеі, спосабы, месцы гаспадарання і промыслаў, якасць глебы і сенажаці, былых жыхароў вёскі, якія карысталіся гэтымі ўрочышчамі, і інш. Шэраг месцаў згадваюцца і апісваюцца і ў вусных успамінах у сувязі з пэўнымі падзеямі.

Багатая мікратапанімія вёскі вызначае жыццёвую прастору ліплянцаў, іх гаспадарчыя стратэгіі, гісторыю і культуру, фіксуе асаблівасці гаворкі. Часам мікратапонімы маюць вельмі вузкае кола выкарыстання: жыхары адной часткі вёскі могуць не ведаць аб існаванні пэўных назваў у другой. Мікратапанімія Ліплян, з аднаго боку, дынамічна змяняецца, а з другога, стала захоўвае традыцыйныя назвы ў супрацьвагу афіцыйным. Апошнія так і не сталі часткай ліплянскай культуры. Праведзены аналіз дазваляе сцвярджаць, што мікратапанімія з'яўляецца няўстойлівай і дынамічнай з пункта гледжання гістарычнай перспектывы і мовы.

Прадстаўленыя ў біяграфічных аповедах наратывы пра гісторыю і прастору вёскі могуць быць прааналізаваны з дапамогай лінгвістыкі, этнаграфіі, гістарычнай геаграфіі, археалогіі, а таксама стаць крыніцай для цэлага шэрагу дысцыплін, бо захоўваюць інфармацыйную цэласнасць і кантэкст, уключаючы пазалакальныя сувязі, апісанне месцазнаходжання аб'ектаў, тлумачэнне назвы, арыгінальнае вымаўленне назвы, важнасць аб'екта ў кантэксце гістарычных падзей, гаспадарчых стратэгій, карціны свету жыхароў вёскі.

*Дадатак*

**Мікратапонімы наваколля вёскі Ліпляны Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці**

| Назва | Аб'ект, тлумачэнне | Вусны ўспамін | Дата згадвання ў дакументах | Лакалізацыя |
|---|---|---|---|---|
| Азярэц | Урочышча | *«**Азярэц** знаходзіўся за рэчкай на Малым Сяле. [Гэтамсама і] возера **Торцін**»* (*Ніна Лось*) | 1866 | На правым беразе Убарці, на ўсход ад вёскі |
| Баравое (Баровае) | Узвышша | *«**Баравое** – самае высокае месца ў ваколіцах Ліплян, каля возера **Торцін** і **Ніўкі**. Зімой мы там каталіся на санках»* (*Міхаіл Сечка*) | 1866 | На поўдзень ад вёскі |
| Бярэзнік | Лес | *«У памяці **Валовае**, **Бярэзнік**, куды хадзіў у ягады і грыбы...»* (*Уладзімір Паўлечка*) | – | На поўнач ад вёскі |
| Валовае | Урочышча | *«Лось Аляксей Кліменцьевіч, 1914 г. нараджэння, ён камуніст. Яго расстраляла наша паліцыя. Урочышча **Валовае**. Там дзе яго расстралялі, там і пахавалі»* (*Ніна Лось*) | 1866, 1948 | На поўнач ад вёскі. Побач з урочышчам Чезаніца (на ўсход) і Пэрэлайна (на поўдзень) |
| Восмаля | Селішча, частка вёскі | «Во́смаля – на Вялікім Сяле» (Ніна Лось) | – | Вялікае Сяло |
| Высокае | Урочышча | – | 1866 | На паўнёвы захад ад вёскі |
| Вялікае Поле (Вялікае Балота, Гнілое Балота) | Пасёлак, частка вёскі | – | 1866 | Цяпер тэрыторыя вёскі |
| Горчэнь | Урочышча | – | 1866 | На ўсход ад вёскі |
| Гліна (Глінішча) | Урочышча | – | 1848 | На правым беразе Убарці, на ўсход ад вёскі |
| Глумча (Гумна) | Урочышча | – | 1866 | На правым беразе Убарці, на паўднёвы ўсход ад вёскі |
| Даліна | Урочышча | *«Прыгожае было месца. Называецца **Даліна**»* (*Людміла Ашомка*) | – | Паміж Вялікім Сялом і Печкай |
| Дзярытак | Частка вёскі | «*[Цэнтрам Малога Сяла] быў Дзярытак*» (*Міхаіл Сечка*) | – | На Малым Сяле |
| Доўгае | Урочышча | *«Казалі: "Пойдзем на **Доўгае** сена касіць"»* (*Ніна Лось*) | 1866 | На ўсход ад вёскі |
| Дуброва | Урочышча | – | 1866 | На ўсход ад вёскі |
| Дубровец | Урочышча | – | 1866 | На поўдзень ад Чэзаніцы і на поўнач ад вёскі |
| Дубровіца | Урочышча | – | 1866 | На поўдзень ад вёскі |
| Ельніца | Урочышча | – | 1866 | На поўдзень ад вёскі |
| Елье | Урочышча, малады ельнік | *«Такая пайшла мода ў 1980-я гг... у вёсцы вельмі пачалі самагонку гнаць. Самагонны апарат быў амаль у кожнага. У **Ельі** – самагонны апарат, і У Лузе – самагонны апарат»* (*Ніна Лось*); *«А мы ж хаваліся ў Ельі. Покідалі хаты да паўцякалі ў Елье, бо баяліся. А як не будуць шукаць, то блізка Елье, то мы ў Елье папаўзом і туды пойдам к своім в курэнь»* (*Клаўдзія Лось*) | – | У 2 км на паўднёвы захад ад Ліплян (Пасёлку) у напрамку Лельчыц |
| Енціпіха | Сенажаць | *«**Енціпіха** – гэта такое месца вышэй. І там расла не вельмі добрая трава. Во сабраліся Самсоны. Сталі думаць і гадаць, як Енціпіху абмінаваць»* (*Георгій Казачэнка*) | – | Узбярэжжа Убарці каля Вялікага Сяла |
| Жукоў | Урочышча, сенажаць | *«Людзі ўсе ў лесе булі. У нас называецца такое ўрочышча **Жукоў**. То ўсе туды хаваліся. Там і кураня рабілі»* (*Вольга Сечка*) | – | Недалёка ад Малога Сяла |
| За Мохам | Урочышча | – | 1866 | На поўнач ад вёскі |
| Закалодне | Урочышча | – | 1866 | На ўсход ад вёскі |
| Закружы (Закружжа) | Урочышча, поле | *«Яшчэ сонейка не ўзыходзіла, падымаліся людзі, даілі каровы і выганялі. Ішлі на поле калгаснае. На **Закружжа**. Так называлася тое месца»* (*Ніна Лось*) | 1866 | На поўнач ад вёскі, недалёка ад урочышча Вялікае Поле |

*Працяг табліцы*

| Назва | Аб'ект, тлумачэнне | Вусны ўспамін | Дата згадвання ў дакументах | Лакалізацыя |
|---|---|---|---|---|
| Залешчан | Урочышча | – | 1866 | На поўдзень ад вёскі |
| Западаўжа | Урочышча | *«**Западаўжа** – гэта былі палі людскія» (Ніна Лось)* | 1866 | На правым беразе Убарці, на паўнёвы ўсход ад вёскі |
| Запалавінскай рэчкай | Урочышча | – | 1866 | На правым беразе Убарці, на паўднёвы ўсход ад вёскі |
| Запачапін | Урочышча | *«[Ад канца Вялікага Сяла] была канава. Яе асушылі. Называлася месца **Запачапін**. Тут заўсёды размывала ўсё» (Людміла Ашомка)* | – | Вялікае Сяло |
| Каля царквы (Цвінтар, Каля Ліпы) | Урочышча | *«**Цвінтар** тыя разы казалі. Тутака цэркву спалілі. Тамака хрэст паставілі. Ручніка вешалі. І кожнае свята» (Марыя Казачэнка)* | 1866 | Цэнтар пасёлка Вялікае Поле |
| Каралёў | Урочышча | – | 1866 | На поўдзень ад вёскі |
| Клінаваха, Карбана | Урочышча, месца на рэчцы, дзе яна ўтварала пятлю | *«**Клінаваха** – гэта на рэчцы так называлася метраў 200» (Георгій Казачэнка)* | – | Вялікае Сяло |
| Князеў Брод | Урочышча | *«У Князевым Бродзе пасярэдзіне **Даліна**, а так толькі карчы» (Ніна Лось)* | – | Паміж Вялікім Сялом і Вялікім Полем |
| Красная Горка | Урочышча | *«Красная Горка – высокая гара, дзе сілас нарыхтоўвалі, падводамі вазілі» (Ніна Лось).* Ва ўрочышчы выяўлены рэшткі паселішча эпохі неаліту і бронзавага веку | – | На паўднёвы ўсход ад вёскі |
| Круг | Урочышча | – | 1866 | На поўнач ад вёскі, на поўдзень ад урочышча Наўглі |
| Крыво | Урочышча | – | – | |
| Лезаніца (Лозніца) | Сенажаць, лес, магчыма ад «езы» – запруды для лоўлі рыбы | *«У лесе і **Лезаніца**. Была Лезаніца адна на рэчцы, другая – у лесе» (Георгій Казачэнка)* | 1866 | На ўсход ад вёскі |
| Люпіня | Урочышча | – | 1866 | На правым беразе Убарці, на паўднёвы ўсход ад вёскі |
| Ліснае | Урочышча | *«Я памятаю, хадзілі па шчаўе. У **Ліснае**. У нас такое ўрочышча ёсць. Далёка трохі. Ірвалі шчаўе і на базар неслі прадаваць» (Ніна Лось)* | – | – |
| Лысая Гара | Гара | *«Дарога [ішла] на Лельчыцы з Малога Сяла: па левы бок – Торцін, а па правы – **Лысая Гара**» (Ніна Лось)* | – | На паўднёвы захад ад вёскі |
| Марыніч | Урочышча | *«У полі ўзгорак быў. **Марыніч** там жыў. [Багаты чалавек]» (Ніна Лось)* | 1866 | На поўнач ад вёскі, каля урочышча Круг |
| Міжтор'е | Урочышча | – | 1866 | На поўдзень ад вёскі |
| На Горе | Урочышча | – | 1866 | На поўдзень ад вёскі |
| Навалоўцы | Урочышча | – | 1866 | На паўднёвы захад ад вёскі |
| Нагрудках | Урочышча | – | 1866 | На правым беразе Убарці, на ўсход ад вёскі |
| Назадне | Урочышча | – | 1866 | На ўсход ад вёскі |
| Накрананавіцы | Урочышча | – | 1866 | На паўднёвы захад ад вёскі |
| Наўглі | Урочышча | – | 1866 | На поўнач ад вёскі, каля урочышча За Мохам |
| Наўч | Урочышча | – | 1866 | На поўнач ад вёскі, каля урочышча Круг |
| Ніўча, Ніўка | Урочышча, невялікая паляна ў лесе | *«У нас аж трое могілак. Одныя на Малой дзерэўні. Одные на [Вялікім сяле]. Іх закрылі. А трэція, на полі, у **Ніўчах**, называюцца. Ужо там хороняць» (Іван Лось)* | – | На паўднёвы захад ад вёскі |

*Працяг табліцы*

| Назва | Аб'ект, тлумачэнне | Вусны ўспамін | Дата згадвання ў дакументах | Лакалізацыя |
|---|---|---|---|---|
| Нелепоў | Лес | *«У лес ходзілі. Там **Нелепоў** зваўся. То там былі маліны»* (*Ганна Лось*) | – | – |
| Осык | Урочышча | – | 1866 | На паўночны захад ад вёскі, побач з урочышчам За Мохам |
| Победные Горы | Урочышча | *«На **Победные Горы** ездзіў сена касіць»* [1] | – | – |
| Погреб | Урочышча | – | – | На поўдзень ад вёскі |
| Поло́віна | Поле | *«Там было таксама поле. Называлася месца **Поло́віна**»* (*Людміла Ашомка*) | – | У канцы Вялікага Сяла |
| Петрыкава Лучка | Сенажаць | *«Рэчка цякла, некалькі разоў мяняла сваё рэчышча. У нас гэта месца называлі **Пертыкава Лучка**»* (*Георгій Казачэнка*) | – | На Вялікім Сяле |
| Пералайна | Хутар | *«Мой дзед Сцяпанчык яго звалі пераехаў з **Пералайна** [ў вёску]* (*Ніна Лось*); ***Пералайна** – гэта ў лесе [былы хутар]»* (*Георгій Казачэнка*) | 1866 | На поўнач ад вёскі |
| Печка | Пасёлак | *«Наша сям'я жыла ў такім невялікім аддзяленні, дзе дзевяць хат, называлася яно **Печка**»* (*Уладзімір Паўлечка*) | – | Частка вёскі |
| Прысынак | Урочышча | – | 1866 | На правым беразе Убарці, на паўднёвы ўсход ад вёскі |
| Перлок | Урочышча | – | 1866 | На поўнач ад вёскі, недалёка ад урочышча Вялікае Поле |
| Пясінае | Урочышча | – | 1866 | На поўдзень ад вёскі |
| Пясочнае | Урочышча | – | 1866 | – |
| Расач | Урочышча | – | 1866 | На поўнач ад вёскі, побач з урочышчам За Мохам |
| Роўля | Поле | *«На полі **Роўля** пахаваны быў Кашырцаў Сяргей»* (*Ніна Лось*) | – | Паміж Вялікім Сялом і Вялікім Полем |
| Саракан | Урочышча | *«Падчас вайны хаваліся ў такім урочышчы, называлася **Саракан**. Ад слова "сарока"»* (*Георгій Казачэнка*) | – | На паўднёвы захад ад вёскі |
| Слепча | Хутар | *«Туркі, як прыходзілі ў наш раён, і разграбілі цэркаў [у Ліплянах], і ўкралі тую ікону, і доехалі до Слепчы. Чого яна называецца Слепча, бо послеплі і людзі, і коні. А гэта ікона вярнулася назад у Ліпляны. Моя бабуля расказвала»* (*Марыя Кольбіна*) | 1866, канец XIX ст. | У 9 км ад Лельчыц. На поўнач ад вёскі, побач з урочышчам За Мохам |
| Сні́кі | Селішча | *«На Вялікім Сяле [на поўнач], дзе селішча мельніка – **Сні́кі**»* (*Ніна Лось*) | – | Вялікае Сяло |
| Сухая | Урочышча | – | 1866 | На паўночны захад ад вёскі, побач з урочышчам Пералайна |
| Сцепка | Урочышча | – | 1866 | На паўднёвы захад ад вёскі |
| У Лузе | Урочышча | *«Я знаю маці роскazвала, як ховаліся У **Лузе**»* (*Вольга Сечка*); *«У Лузе – самагонны апарат»* (*Ніна Лось*) | – | Паміж Вялікім Сялом і Вялікім Полем |
| У Рова | Урочышча | – | 1866 | На паўднёвы захад ад вёскі |
| Удабраго | Урочышча | – | 1866 | На паўднёвы ўсход ад вёскі |
| Укарэні | Урочышча | – | 1866 | На поўдзень ад вёскі |
| Унарву | Урочышча | – | 1866 | На ўсход ад вёскі |
| Цаўціна | Урочышча | – | 1866 | На ўсход ад вёскі |

*Заканчэнне табліцы*

| Назва | Аб'ект, тлумачэнне | Вусны ўспамін | Дата згадвання ў дакументах | Лакалізацыя |
|---|---|---|---|---|
| Цесень | Урочышча | – | 1866 | На поўнач ад вёскі |
| Чэзаніца | Урочышча | – | 1866 | На поўнач ад вёскі |
| Штоварыцнам | Урочышча | – | 1866 | На поўнач ад вёскі |
| Убарць | Рака | – | 1412 | – |
| Бороске | Возера | *«У нас вось кругом Ліплян такія озёра. Іх імяна:* ***Торцін, Бороске, Кіцінскіе, Рогатыя, Родоцкія, Крыве...*** *Потом* ***Кругленькія, Верасецкія, Зялёнае.*** *Озёра кругом вёскі... Дажа* ***Ванячае»*** (*Еўдакія Пракаповіч*) | 1850, 1915 | Торцін у 3 км на паўнёвы ўсход ад Лельчыц |
| Верасецкіе | Возера | | | |
| Вонячае | Возера | | | |
| Зялёнае | Возера | | | |
| Кіцінскіе | Возера | | | |
| Кругленькіе | Возера | | | |
| Крыве | Возера | | | |
| Торцін | Возера | | | |

## ЛІТАРАТУРА І КРЫНІЦЫ

1. Полесский этнолингвистический сборник: материалы и исследования / Академия наук СССР, Институт славяноведения и балканистики. – М., 1983. – 286 с.

2. Иванова, А. А. Микротопонимия Мозырского Полесья / А. А. Иванова. – Мозырь, 2007. – 219 с.

3. Шклярык, В. А. Мікратапанімія Усходняга Палесся ў кантэксце развіцця рэгіянальнай лексічнай сістэмы / В. А. Шклярык. – Мінск, 2019. – 196 с.

4. Кучук, І. М. Палескі слоўнік. Лельчыцкі раён / І. М. Кучук, А. К. Малюк. – Мазыр, 2000. – 155 с.

5. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Лельчыцкага раёна / уклад.: М. З. Башлакоў, Дз. С. Жук. – Мінск, 2002. – 606 с.

6. Хроніка Убарцкага Палесся / аўт.-склад. А. І. Атнагулаў. – Мінск, 2001. – 495 с.

7. Іванова, В. Ліпляны. Біяграфія і штодзённасць беларускай вёскі / В. Іванова. – Мінск, 2019. – 404 с.

8. Беларускі архіў вуснай гісторыі [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: nashapamiac.org. – Дата доступу: 15.05.2020.

9. НГАБ. – Ф. 1477. Воп. 1. Адз. зах. 1833.

10. Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Ф. 23. Воп. 11. Спр. 2. Запісана Т. Кухаронак і Т. Валодзінай ў 2011 г.

***Ольга Иванова***

## УСТНЫЕ ВОСПОМИНАНИЯ КАК ИСТОЧНИК ПО ИСТОРИИ СЕЛЬСКОЙ МИКРОТОПОНИМИИ (НА ПРИМЕРЕ ДЕРЕВНИ ЛИПЛЯНЫ ЛЕЛЬЧИЦКОГО РАЙОНА ГОМЕЛЬСКОЙ ОБЛАСТИ)

*Резюме*

**Ключевые слова:** устная память, микротопонимия, Убортское Полесье, источниковедение, локальность, позалокальность, хозяйственные стратегии.

Оценено значение устных воспоминаний как источника описания географических особенностей деревни Липляны Лельчицкого района, фиксации и локализации микротопонимов, сравнения их с опубликованными и неопубликованными (архивными) источниками. Сделан вывод о том, что их существование динамично и нестабильно. Оно является значимым для характеристики мироощущения сельских жителей, установления границы между локальностью и позалокальностью, описания исторических событий, экономические стратегий и культурных особенностей.

***Volga Ivanova***

## ORAL MEMORIES AS A SOURCE OF THE HISTORY OF VILLAGES' MICROTOPONYMS (THE EXAMPLE OF THE VILLAGE OF LIPLJANY OF THE LELCHYCY DISTRICT OF THE GOMEL REGION)

*Summary*

**Keywords:** oral memory, microtoponyms, Ubarts' Polesie, source studies, locality, non-locality, economic strategies.

The paper deals with the significance of oral memories as a source for determining the geographical features of the village of Liplyany, Lelchytskyi district, fixing and localizing microtoponyms, comparing them with published and unpublished (archival) sources. It is concluded that their existence is dynamic and unstable, that it is important to reveal the worldview of the villagers, to establish the boundary between locality and non-locality, to describe historical events, economic strategies and culture.

*Дата паступлення ў рэдакцыю: 20.11.2020*